- аказвае арганізацыйна-метадычную дапамогу наймальнікам па пытаннях прымянення заканадаўства аб працы і ахове працы;

- праводзіць інфармацыйна-тлумачальную працу і кансультаванне грамадзян па пытаннях сацыяльна-працоўнай сферы;

- разглядае ў адпаведнасці з заканадаўствам звароты грамадзян, індывідуальных прадпрымальнікаў і юрыдычных асоб, арганізуе асабісты прыём, прымае меры па ўдасканаленні работы са зваротамі;

- прымае ад суб'ектаў гаспадарання і грамадзян заяву і дакументы, неабходныя для назначэння пенсій і дапамог;

-арганізуе тлумачальную працу сярод насельніцтва па пытаннях пенсійнага забеспячэння шляхам выступаў у друку, па радыё, правядзенне гутарак на прадпрыемствах і суб'ектах гаспадарання ўсіх формаў уласнасці;

- праводзіць працу па аказанні дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі малазабяспечаным сем'ям і грамадзянам, матэрыяльнай дапамогі асобам, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі;

- вырашае пытанні па вызначэнні грамадзян у стацыянарныя ўстановы сацыяльнага абслугоўвання;

- праводзіць інфармацыйна-тлумачальную працу і кансультаванне па пытаннях прадастаўлення льгот і гарантый розным катэгорыям насельніцтва;

- інфармуе насельніцтва аб стане рынку працы Смаргонскага раёна, аб патрэбнасці ў рабочай сіле, магчымасці прафесійнай падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі беспрацоўных, зменах у заканадаўстве аб занятасці насельніцтва;

- ажыццяўляе ўлік грамадзян, якія звярнуліся па пытаннях працаўладкавання, рэгіструе беспрацоўных, аказвае ім садзейнічанне ў падборы падыходнай працы, а наймальнікам – у забеспячэнні іх работнікамі.

- праводзіць прафесійную арыентацыю і псіхалагічную падтрымку насельніцтва, накіроўвае беспрацоўных на прафесійную падрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі, перападрыхтоўку;

- садзейнічае забеспячэнню занятасці грамадзян, не здольных на роўных умовах канкурыраваць на рынку працы і якім дзяржава прадастаўляе дадатковыя гарантыі занятасці;

- удзельнічае ў рэгуляванні прыцягнення замежнай працоўнай сілы.